*Святлана Кулеш, Таццяна Кузіна*

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСІ: ДАВЕР НАСЕЛЬНІЦТВА І ЎДЗЕЛ У ПРЫНЯЦЦІ РАШЭННЯЎ

Мэтай даследавання было вывучыць стаўленне насельніцтва Беларусі да арганізацый грамадзянскай супольнасці, вызначыць узровень даверу да іх у параўнанні з даверам да іншых грамадскіх інстытутаў, а таксама вывучыць агульны фон даверу ў беларускім грамадстве. Акрамя таго, ва ўмовах больш шырокіх магчымасцяў удзелу грамадзян у прыняцці рашэнняў і тэндэнцыі на ўзмацненне ўзаемадзеяння грамадзянскай супольнасці і мясцовых органаў улады было цікава ацаніць погляды беларусаў на прынцыпы і спосабы ўдзелу грамадзян у прыняцці рашэнняў, а таксама прасачыць існуючую ўзаемасувязь. Дадзеныя атрыманыя ў ходзе нацыянальнага сацыялагічнага апытання, праведзенага ў снежні 2017 года Беларускай аналітычнай майстэрняй (BAW) з ініцыятывы АДУ «Цэнтр даследавання грамадскага кіравання SYMPA» і грамадскай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі!».

## Давер

Што такое давер? Яго можна азначыць як чаканне чалавекам сумленных паводзінаў з боку іншых людзей, груп ці арганізацый. Для разумення кантэксту даверу ў грамадстве і перспектываў развіцця міжсектарнага дыялогу мы прааналізавалі давер у беларускім грамадстве на трох узроўнях: генералізаваны (агульны) давер; спецыфічны давер да некаторых дзяржаўных і

недзяржаўных інстытутаў, а таксама міжасабовы давер. Паколькі можна чакаць, што з падвышэннем узроўню даверу да арганізацый грамадзянскай супольнасці людзі з большай верагоднасцю будуць гатовыя далучацца да іх, гэта таксама дазволіць ацаніць магчымасці росту грамадскай актыўнасці ў нашай краіне.

У многіх дакументах міжнародных арганізацый, якія вызначаюць дэмакратычныя стандарты ўдзелу грамадзян у прыняцці рашэнняў, давер паміж сектарамі грамадства ўключаецца ў пералік неабходных умоваў развіцця дыялогу паміж дзяржавай і грамадзянскай супольнасцю. Напрыклад, у Кодэксе рэкамендаванай практыкі грамадскага ўдзелу ў працэсе прыняцця рашэнняў і Кіруючых прынцыпах у дачыненні да грамадзянскага ўдзелу ў працэсах прыняцця палітычных рашэнняў (дакументы Савета Еўропы па пытанні грамадскага ўдзелу) давер, які мае на ўвазе транспарэнтнасць (празрыстасць), павагу і ўзаемную адказнасць, фігуруе сярод асноўных прынцыпаў, неабходных для ўмацавання канструктыўных узаемаадносінаў. Згодна з праектам Асноўных прынцыпаў для дзяржаў па эфектыўным ажыццяўленні права на ўдзел у вядзенні дзяржаўных спраў, падрыхтаваным Упраўленнем Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, адкрытае і сумленнае ўзаемадзеянне паміж дзяржаўнымі органамі і грамадствам з’яўляецца ўмовай рэалізацыі права на ўдзел у вядзенні дзяржаўных спраў. У дакуменце дзяржавам рэкамендуецца прыняць меры для ўмацавання ўзаемнага даверу паміж органамі кіравання і прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці.

### *Агульны давер*

Агульны давер — гэта давер да людзей у цэлым, незалежна ад знаёмства з імі або іх прыналежнасці да пэўных групаў. Жыхары Беларусі практычна пароўну размеркаваныя паводле ўзроўню генералізаванага даверу / недаверу: 46,8% аддаюць перавагу першапачаткова давяраць людзям; 41,4% мяркуюць, што больш правільна ставіцца з падазрэннем (дыяграма 1).

Больш за палову (55,9%) жыхароў Беларусі лічаць, што давер з’яўляецца ўмовай поспеху ў жыцці, і ўсяго трацiна апытаных (35,6%) лічыць, што паспяховым можа быць толькі той, хто нікому не верыць на слова (дыяграма 2).




*Дыяграма 1.*
*Размеркаванне адказаў на пытанне:*
*«Што, паводле вашага меркавання, больш правільна?»*




*Дыяграма 2.*
*Размеркаванне адказаў на пытанне:*
*«Якое з двух сцвярджэнняў больш адпавядае вашым думкам?»*

Жанчыны адрозніваюцца высокім узроўнем даверу ў цэлым. Сярод іх больш і тых, хто лічыць, што ад даверу залежыць поспех у жыцці (60,7% супраць 50,1% сярод мужчын), і схільных адпачатку давяраць людзям, нягледзячы на магчымасць памылкі (51,5% супраць 41,2% сярод мужчын).

Рэспандэнты ўзростам ад 65 гадоў у большай ступені асацыююць поспех з даверам да навакольных (61,3%), чым прадстаўнікі іншых узроставых груп (дыяграма 3).

Самымі «недаверлівымі» апынуліся маладыя людзі 18–24 гадоў: 41,2% рэспандэнтаў у гэтай групе лічаць, што стаць пасляховым чалавекам зможа толькі той, хто нікому не верыць на слова. У групе старэйшых за 65 гадоў гэты паказчык дасягае ўсяго 27,8%.

Амаль палова насельніцтва нашай краіны больш настроеная на давер і супрацу і лічыць давер залогам поспеху ў жыцці. Гэткая настроенасць важная для вырашэння агульнасацыяльных і прафесійных праблем, бо эфектыўнасць гэтых працэсаў шмат у чым залежыць ад ступені даверу паміж партнёрамі ва ўзаемадзеянні.

## *Давер да дзяржавы і сацыяльных інстытутаў*

Негатыўныя крызісныя тэндэнцыі апошніх гадоў у эканоміцы Беларусі паказваюць абмежаваныя магчымасці ўрада ўплываць на сітуацыю ў краіне. Ва ўладаў, па вялікім рахунку, не атрымліваецца выконваць свае абяцанні па падтрыманні «сацыяльнай арыентаванасці» беларускай эканомікі. Рашэнне аб паступовым павышэнні пенсійнага ўзросту, рост тарыфаў на аплату камунальных паслуг, сістэма тэрмінаваных (кароткатэрміновых і сярэднетэрміновых) працоўных кантрактаў, спробы змагацца з «сацыяльным утрыманствам» (дэкрэт № 3 ад 2 лютага 2015 г. і дэкрэт № 1 ад 12 студзеня 2017 г.) прыводзяць да росту заклапочанасці беларускіх грамадзян забеспячэннем сацыяльных правоў, беспрацоўем і яго наступствамі. Большыя сацыяльна-эканамічныя рызыкі прыводзяць да падзення ўзроўню даверу беларусаў да дзяржавы ў пытаннях забеспячэння ўласнага дабрабыту і вымушаюць іх разлічваць пераважна на ўласныя сілы. Толькі чвэрць апытаных (25,2%) упэўненыя, што ўрад адказвае за дабрабыт сваіх грамадзян і абавязаны дапамагаць людзям, калі яны ў бядзе, у той час як 63,4% рэспандэнтаў лічаць, што людзі




*Дыяграма 3.*
*Давер як фактар поспеху:*
*размеркаванне паводле ўзросту рэспандэнтаў*




*Дыяграма 4.*
*Размеркаванне адказаў на пытанне «Якое з ніжэйпрыведзеных меркаванняў, на ваш погляд, лепш апісвае сітуацыю ў Беларусі?»*

самі адказваюць за свой дабрабыт і абавязаныя самастойна вырашаць свае праблемы (дыяграма 4).

Жанчыны (29,3%) больш, чым мужчыны (20,2%), разлічваюць на падтрымку дзяржавы (дыяграма 5). Жанчыны ў большай ступені нясуць на сабе клопат пра дзяцей і састарэлых сваякоў і вымушаныя ў большай ступені спадзявацца на дзяржаўную сацыяльную падтрымку: аплачваюцца адпачынак па доглядзе дзіцяці да трох гадоў з гарантыяй захавання працоўнага месца, бальнічныя лісты па доглядзе хворага дзіцяці, сістэма льготаў і інш. Акрамя таго, жанчыны ў Беларусі жывуць у сярэднім на 10 гадоў даўжэй за мужчын (чаканая працягласць жыцця жанчын у 2017 г. была 79,2 года, а мужчын — 69,3 года). Адпаведна, беларускі больш залежаць і ад сістэмы пенсійнага забеспячэння, а таксама даўжэй карыстаюцца нацыянальнай сістэмай (бясплатнага) медыцынскага абслугоўвання.

Мужчыны ў меншай ступені залежаць ад сістэмы сацыяльнай падтрымкі, у сярэднім больш зарабляюць (паводле дадзеных Белстата, у 2017 г. заработная плата жанчын у Беларусі складала ў сярэднім 76,4% ад заработнай платы мужчын) і гатовыя ў большай ступені разлічваць на сябе ў вырашэнні пытанняў матэрыяльнага дабрабыту.

Размеркаванне па ўзросту ў гэтым пытанні чаканае: людзі ад 65 гадоў і старэйшыя больш за астатнія групы разлічваюць на дзяржаву ў пытаннях дабрабыту (33,5%), у рэспандэнтаў ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў — найменшы паказнік (19,6%). Людзі сталага ўзросту больш залежныя ад сацыяльнай падтрымкі дзяржавы: пенсійнае забеспячэнне, медыцынскае абслугоўванне, ільготныя цэны на лекі і да т. п. (дыяграма 6).

Супастаўленне атрыманых дадзеных з даследаваннямі, праведзенымі ў Беларусі за апошняе дзесяцігоддзе, дазваляе казаць пра змены ва ўспрыманні беларускімі грамадзянамі дзяржавы як гаранта стабільнасці і сацыяльнай абароненасці: у беларусаў зніжаецца ўзровень патэрналізму і больш няма цвёрдай упэўненасці ў тым, што дзяржава вырашыць іх сацыяльна-эканамічныя праблемы.

Гэтыя змены важныя, бо людзі, схільныя больш спадзявацца на сябе ў вырашэнні праблем, часцей схільныя праяўляць грамадскую актыўнасць, выступаць за пашыраны ўдзел заці-




*Дыяграма 5.*
*Хто адказвае за дабрабыт грамадзян: гендарныя асаблівасці*




*Дыяграма 6.*
*Хто адказвае за дабрабыт грамадзян: залежнасць ад узросту*

каўленых бакоў у распрацоўцы палітыкі і прыняцці рашэнняў. Яны таксама больш свядома ацэньваюць дзейнасць грамадскіх арганізацый, іх праграмы і мэты.

Беларусаў, якія не давяраюць дзяржаўным і недзяржаўным сацыяльна-палітычным інстытутам, больш, чым тых, хто давярае (дыяграма 7).




*Дыяграма 7.*
*Ацэнка рэспандэнтамі ступені даверу сацыяльным інстытутам*

Найбольшым даверам у рэспандэнтаў карыстаюцца царква (58,2%), прэзідэнт (42,8%) і армія (41,3%), і толькі ў выпадку царквы колькасць тых, хто давярае, перавышае колькасць тых, хто не мае даверу.

«Антырэйтынг» (найбольшы недавер) узначальваюць мясцовыя органы ўлады, якім не давяраюць 57% рэспандэнтаў, галіновыя міністэрствы і ведамствы — 51,8% і Нацыянальны сход — 50,9%. Пры гэтым высокі ўзровень недаверу і да гра-

мадскіх арганізацыяў (50,5% — да падтрыманых дзяржавай і 47,6% — да не падтрыманых дзяржавай).

Беларусы з самым нізкім узроўнем даходаў дэманструюць нізкі ўзровень даверу ў цэлым і да інстытутаў улады ў прыватнасці. Мяркуючы па ўсім, яны не разглядаюць органы ўлады як крыніцу дапамогі ў вырашэнні сацыяльных пытанняў. Найбольшым даверам у гэтай групы карыстаюцца царква — 45,7% і войска — 32,9%.

Узровень даверу да грамадскіх арганізацый і ініцыятыў самы нізкі. Пры гэтым неістотна, вядзецца гаворка пра створаныя з ініцыятывы грамадзян альбо пра ініцыяваныя і падтрыманыя дзяржавай арганізацыі. У падтрыманых дзяржавай арганізацый узровень даверу склаў 29,2%, у непадтрыманых — 24,6%. Але і паказнікі недаверу для падтрыманых дзяржавай арганізацый таксама вышэйшыя — 50,5% супраць 47,6% у не падтрыманых дзяржавай.

Досыць вялікая колькасць людзей выбрала варыянт адказу «Складана адказаць / Няма адказу» пры ацэнцы даверу да грамадскіх арганізацый (20,3% у падтрыманых і 27,8% у не падтрыманых дзяржавай). Магчыма, адсутнасць меркавання абумоўленая нізкай дасведчанасцю людзей пра дзейнасць гэтых арганізацый, і менавіта праз неінфармаванасць беларусы схільныя давяраць грамадскім арганізацыям менш, чым дзяржаўным інстытутам, з якімі рэгулярна ўзаемадзейнічаюць у паўсядзённым жыцці. Пытанне аб прычынах недаверу да арганізацый грамадзянскай супольнасці мае патрэбу ў дадатковым вывучэнні.

Людзі з больш высокім узроўнем генералізаванага даверу і тыя, хто звязвае поспех у жыцці з даверам да асяроддзя, чакана адрозніваюцца больш высокім узроўнем даверу да грамадскіх інстытутаў у параўнанні з «недаверлівымі» і з тымі, хто аддае перавагу нікому не верыць на слова. З гэтай жа прычыны жанчыны таксама з большым даверам, чым мужчыны, ставяцца да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў.

Давер да сацыяльных інстытутаў фарміруецца ў тым ліку і на падставе меркаванняў іншых людзей. Пераважная колькасць рэспандэнтаў адзначылі, што ў апошні час сутыкаліся з крытычнай ацэнкай дзеянняў беларускіх уладаў з боку асяроддзя (дыяграма 8).




*Дыяграма 8.*
*Частата крытыкі ўладаў*

Пытанні асабістага дабрабыту вельмі важныя для людзей: асноўнымі прычынамі крытыкі ўлады сталі падзенне ўзроўню жыцця, рост цэнаў і тарыфаў, рэформы, якія негатыўна ўплываюць на дабрабыт грамадзян, і пагаршэнне эканамічнага стану ў краіне (дыяграма 9).

Сітуацыю з даверам да дзяржаўных інстытутаў пагаршае іх закрытасць ад грамадскасці. З тым, што дзяржорганы не даюць грамадскасці неабходную інфармацыю, згодная большасць апытаных рэспандэнтаў (64,3%) (дыяграма 10).

Людзі з больш высокім узроўнем генералізаванага даверу ў параўнанні з «недаверлівымі» вызначаюцца і больш высокім узроўнем даверу да грамадскіх інстытутаў, чым насельніцтва ў цэлым (дыяграма 11). У прыватнасці, давер да царквы ў гэтай групы складае 66,1% супраць 58,2% у насельніцтва ў цэлым; да прэзідэнта — 50,5% супраць 42,8%; і нават НДА — 27,9% супраць 24,6%.

## *Міжасабовы давер*

Грамадская актыўнасць насельніцтва звязаная з узроўнем міжасабовага даверу і скіраванасцю на салідарнае, канструктыўнае ўзаемадзеянне. Пры ацэнцы ўзроўню такога даверу




*Дыяграма 9.*
*Асноўныя прычыны крытыкі ўлады*




*Дыяграма 10.*
*Размеркаванне адказаў на пытанне «Ці лічыце вы, што дзяржаўныя органы ў нашай краіне прадастаўляюць усю неабходную інфармацыю пра сваю працу, дзеянні, рашэнні?»*

*Дыяграма 11.*
*Узровень інстытуцыйнага даверу / недаверу людзей з высокім і нізкім узроўнем генералізаванага даверу*




*1. Савет Міністраў (урад), 2. Нацыянальны сход (парламент), 3. Прэзідэнт краіны, 4. Галіновыя міністэрствы і ведамствы, 5. Гарвыканкамы, райвыканкамы (мясцовая ўлада), 6. Войска, 7. Царква, 8. Міжнародныя арганізацыі, 9. Грамадскія арганізацыі і ініцыятывы, што падтрымліваюцца дзяржавай (напр., «Белая Русь», БРСМ і да т. п.), 10. Грамадскія арганізацыі і ініцыятывы, што не падтрымліваюцца дзяржавай (напр., ПЦ «Вясна», Беларускі Хельсінкскі камітэт)*






*Дыяграма 12.*
*Як часта вы траплялі ў сітуацыі, калі вас падманвалі блізкія людзі, сябры ці знаёмыя?*

рэспандэнты настроеныя больш аптымістычна, чым у дачыненні да сацыяльных інстытутаў. Большасць апытаных адзначыла, што даволі рэдка (63,4%) або ніколі (17,4%) не траплялі ў сітуацыю, калі іх падманвалі блізкія ці знаёмыя (дыяграма 12).

Калі казаць пра давер да прадстаўнікоў сацыяльных інстытутаў, то найбольшым даверам у жыхароў Беларусі карыстаюцца навукоўцы (76,7%), святары (61,0%) і актывісты грамадскіх арганізацый (48,0%) (дыяграма 13).

Найменш насельніцтва давярае чыноўнікам (24,9%) і палітыкам (23,2%). Адсутнасць значных адрозненняў у ацэнках даверу да гэтых груп можа казаць пра тое, што людзі не бачаць розніцы паміж палітычнай дзейнасцю і дзяржаўным кіраваннем. Ва ўмовах неразвітай прафесійнай палітычнай сферы (палітычныя партыі і рухі) у Беларусі і ролі чыноўнікаў у прыняцці і камунікацыі палітычных рашэнняў гэты зман цалкам апраўданы.

Узровень даверу да пэўных інстытутаў не абавязкова супадае з узроўнем даверу да іх прадстаўнікоў (дыяграма 14). Заўважна адрозніваюцца ўзроўні даверу да чыноўнікаў і да дзяржаўных органаў: нават тым органам мясцовага кіравання, што карыстаюцца найменшым даверам, гатовыя давяраць больш людзей (33,4%), чым чыноўнікам (24,9%).




*Дыяграма 13.*
*Узровень даверу насельніцтва да прадстаўнікоў грамадскіх інстытутаў*




*Дыяграма 14.*
*Параўнанне ўзроўню даверу да інстытутаў і іх прадстаўнікоў*

Актывістам грамадскіх арганізацый, наадварот, гатовыя давяраць у 2 разы больш людзей, чым самім арганізацыям. Важна разумець, што гаворка ідзе не пра канкрэтных дзеячаў грамадзянскай супольнасці, якія былі б шырока вядомыя за межамі трэцяга сектара Беларусі, але пра абагульненую постаць актывіста. Відавочна, асабістыя гісторыі актыўных людзей блі-

жэйшыя і больш зразумелыя людзям, выклікаюць большы давер, чым абстрактная і абязлічаная камунікацыя ад імя арганізацый. Грамадскія арганізацыі, якія імкнуцца павысіць давер людзей, могуць надаваць больш увагі асабістым гісторыям сваіх актывістаў і канцэнтравацца на камунікацыі ад першай асобы.

## Стаўленне насельніцтва да арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС)

На фоне нізкага даверу насельніцтва да грамадскіх арганізацый актуальнымі робяцца пытанні пра тое, якой менавіта беларусы бачаць іх ролю ў соцыуме, якія мадэлі адносін з дзяржавай з'яўляюцца для іх пераважнымі, як дзяржава павінна дзейнічаць у дачыненні да грамадскіх арганізацый.

Ацэньваючы ролю АГС, траціна рэспандэнтаў (32,7%) лічыць, што дзейнасць гэтых арганізацый для грамадства непрыкметная, яны не прыносяць ні карысці, ні шкоды. Пятая частка апытаных (20,0%) лічыць, што АГС садзейнічаюць вырашэнню сацыяльных праблем, практычна такая ж доля (19,3%) адзначыла праваабарончую ролю АГС (табліца 1).

Толькі 12% рэспандэнтаў бачаць АГС у ролі «грамадскага кантралёра» дзейнасці дзяржорганаў. Для пашырэння грамадскага ўдзелу ў прыняцці рашэнняў важна, каб людзі атрымлівалі больш інфармацыі пра станоўчы ўплыў грамадзянскага ўдзелу і кантролю якасці прынятых рашэнняў, а таксама пра спосабы, якімі грамадзянская супольнасць можа гэты кантроль ажыццяўляць, уключаючы канкрэтныя практычныя прыклады.

У цэлым можна казаць пра тое, што ў беларусаў не да канца сфарміравалася ўяўленне аб месцы і ролі АГС у грамадстве, аднак негатыўна яе ацэньвае толькі крыху больш за 10% насельніцтва.

У дачыненні да пазіцыі, якую АГС мусяць займаць у адносінах да дзяржавы, рэспандэнты таксама вылучаюць узаемадзеянне для вырашэння важных грамадству задач і абарону інтарэсаў грамадзян. І зноў функцыя незалежнага кантролю з'яўляецца відавочнай толькі для 13% насельніцтва (табліца 2). Адсутнасць кантактаў з уладай актуальная толькі для невялікай долі насельніцтва (8,6%), у той час як розныя віды кантактаў з уладай ад

*Табліца 1.*
*З якімі з ніжэйпералічаных меркаванняў у дачыненні да грамадскіх аб'яднанняў і іншых некамерцыйных арганізацый / грамадзянскіх ініцыятываў вы згодныя?*

| *Меркаванне* | *Доля тых, хто згодны, %* |
|---|---|
| Не прыносяць ні карысці, ні шкоды, іх дзейнасць для большасці грамадзян непрыкметная і не важная | 32,7 |
| Садзейнічаюць вырашэнню вострых сацыяльных праблем, развіццю сацыяльнай сферы | 20,0 |
| Абараняюць правы грамадзян, спрыяюць праяве грамадскай ініцыятывы | 19,3 |
| Складана адказаць / Няма адказу | 17,0 |
| Аказваюць паслугі і дапамогу толькі сябрам сваёй арганізацыі | 13,6 |
| Ажыццяўляюць незалежны грамадскі кантроль дзейнасці дзяржаўных органаў | 12,0 |
| Ствараюцца для вырашэння асобных задач, якія задавальняюць асабістыя інтарэсы іх кіраўнікоў | 11,1 |
| З'яўляюцца праваднікамі замежных каштоўнасцяў і ідэй | 4,4 |

супрацоўніцтва да канфрантацыі фігуруюць у найбольш папулярных варыянтах адказаў.

У якасці асноўных патрабаванняў, якія дзяржава мае права прад'яўляць АГС, рэспандэнты адзначаюць абавязак дзейнічаць у існуючым прававым полі: не ўдзельнічаць у карупцыі, ухіленні ад падаткаў, прыкрыцці нядобрасумленнага бізнесу, строга выконваць законы, прадастаўляць падрабязную і дакладную справаздачнасць (табліца 3).

*Табліца 2.*
*Якую пазіцыю ў адносінах да ўладаў, на вашу думку, павінны займаць грамадскія аб'яднанні і іншыя некамерцыйныя арганізацыі?*

| *Варыянты адказаў* | *Доля тых, хто даў адказ, %* |
|---|---|
| Сумесна з уладай выпрацоўваць і рэалізоўваць грамадска важныя праграмы | 45,7 |
| Абараняць інтарэсы грамадзян перад органамі ўлады | 37,2 |
| Дапамагаць уладзе ў яе планах і задачах | 18,9 |
| Ажыццяўляць кантроль над дзейнасцю ўлады з мэтай знаходжання памылковых рашэнняў кіраўніцтва | 13,3 |
| Складана адказаць / Няма адказу | 9,6 |
| Займацца сваёй справай, імкнучыся не ўступаць у лішнія кантакты з уладамі | 8,6 |
| Выкарыстоўваць уладу для вырашэння сваіх задач | 6,6 |
| Перашкаджаць уладзе ў рэалізацыі яе планаў і задач | 1,0 |

Толькі нязначная колькасць рэспандэнтаў выступае за падкантрольнае дзяржаве становішча АГС. Так, усяго 16,5% апытаных лічаць, што АГС павінны ўзгадняць свае мэты і задачы з дзяржавай, а 6,9% мяркуюць, што арганізацыі павінны праяўляць лаяльнасць і падтрымку ўладам. Яшчэ менш актуальнае для жыхароў Беларусі абмежаванне ўзаемадзеяння грамадзянскай супольнасці з палітыкай (5,1%) і бізнесам (1,8%).

Прыкладна па траціне рэспандэнтаў лічаць, што дзяржава павінна ствараць спрыяльныя ўмовы для работы ўсім АГС, якія

*Табліца 3.*
*Якія патрабаванні, на ваш погляд, дзяржава мае права прад'яўляць грамадскім аб'яднанням і іншым некамерцыйным арганізацыям?*

| *Варыянты адказаў* | *Доля тых, хто даў адказ, %* |
|---|---|
| Не ўдзельнічаць у карупцыі, ухіленні ад падаткаў, прыкрыцці нядобрасумленнага бізнесу | 50,2 |
| Строга выконваць законы | 47,8 |
| Прадстаўляць падрабязную і дакладную справаздачнасць | 31,6 |
| Весці высокаэфектыўную дзейнасць | 26,3 |
| Узгадняць мэты і задачы дзейнасці арганізацыі з дзяржаўнымі органамі | 16,5 |
| Ніякіх | 7,4 |
| Праяўляць лаяльнасць да ўлады, падтрымліваць яе ініцыятывы | 6,9 |
| Складана адказаць / Няма адказу | 6,4 |
| Адмовіцца ад падтрымкі з-за мяжы | 5,8 |
| Не ўдзельнічаць у палітычнай дзейнасці | 5,1 |
| Адмовіцца ад цесных кантактаў з бізнесам | 1,8 |

не наносяць шкоды грамадству, а таксама дапамагаюць грамадзянам вырашаць іх праблемы (табліца 4).

Ацэньваючы ўзаемаадносіны дзяржавы і грамадзянскай супольнасці, чвэрць (26,7%) рэспандэнтаў адзначылі, што дзяржава на дадзеным этапе імкнецца кантраляваць дзейнасць грамадскіх арганізацый (табліца 5). Адказ «Цяжка адказаць» (17,2%) стаў другім па папулярнасці, што сведчыць пра адсутнасць інфармацыі і / або цікавасці ў рэспандэнтаў да сітуацыі, у

якой працуюць АГС у Беларусі. Іншыя пазітыўныя і негатыўныя ацэнкі стаўлення ўладаў да АГС размяркоўваюцца досыць раўнамерна на нізкіх пазіцыях.

*Табліца 4.*
*Для дзейнасці якіх грамадскіх аб'яднанняў і іншых некамерцыйных арганізацый / грамадзянскіх ініцыятываў улады павінны ствараць спрыяльныя ўмовы?*

| *Варыянты адказаў* | *Доля тых, хто даў адказ, %* |
|---|---|
| Арганізацыям, дзейнасць якіх не наносіць шкоды грамадству і краіне | 36,6 |
| Па магчымасці — усім без выключэння | 36,0 |
| Арганізацыям, якія дапамагаюць грамадзянам у вырашэнні іх надзённых праблем | 29,0 |
| Якія ўдзельнічаюць у вырашэнні пытанняў мясцовага жыцця ў сваім горадзе (вёсцы, пасёлку) | 21,8 |
| Якія ўдзельнічаюць у выкананні задач, пастаўленых кіраўніцтвам краіны | 10,3 |
| Якія своечасова прадстаўляюць справаздачнасць аб сваёй дзейнасці | 7,1 |
| Ніякім | 4,8 |
| Няма адказу | 0,6 |

*Табліца 5.*
*На вашу думку, як цяпер дзяржава ў цэлым ставіцца да грамадскіх аб'яднанняў і іншых некамерцыйных арганізацый / грамадскіх ініцыятыў?*

| *Варыянты адказаў* | *Доля тых, хто даў адказ, %* |
|---|---|
| Спрабуе ўсталяваць кантроль над імі | 26,7 |
| Цяжка адказаць / Няма адказу | 17,2 |
| Ставіцца да іх абыякава, ігнаруе іх | 15,8 |
| Наладжвае супрацоўніцтва з імі як з раўнапраўнымі партнёрамі | 15,7 |
| Спрабуе дапамагаць і супрацоўнічаць, але робіць гэта няўмела | 15,0 |
| Існуе вялікі разрыў паміж абвяшчаемай і фактычнай палітыкай дзяржавы ў дачыненні да грамадскіх аб'яднанняў | 13,5 |
| Спрабуе знішчыць незалежныя ініцыятывы | 12,4 |
| Заахвочвае іх развіццё | 8,6 |
| Паслядоўнай дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне не існуе | 7,0 |

## Грамадзянскі ўдзел: акторы, працэс, гатоўнасць

Дынаміка развіцця грамадскай супольнасці цесна звязаная са стаўленнем насельніцтва да грамадзянскага ўдзелу, які ёсць працэсам уключэння і ўлічвання інтарэсаў грамадзян падчас прыняцця палітычных рашэнняў. Апошнім часам у Беларусі з'явілася станоўчая дынаміка ў гэтай сферы: з'яўляецца заканадаўства, якое рэгулюе асобныя формы ўдзелу, расце колькасць публічных абмеркаванняў. Аднак далейшыя станоўчыя змены будуць

немагчымыя, калі ўсе бакі працэсу, уключаючы і прадстаўнікоў улады, і актывістаў грамадзянскай супольнасці, не ўсвядомяць важнасць грамадзянскага ўдзелу і не набудуць неабходныя для гэтага веды і навыкі.

Беларусы зацікаўленыя ў шырокім удзеле ў працэсе вырашэння грамадска значных праблем. Так, на думку 55% апытаных, дзяржава мусіць забяспечыць максімальна шырокі ўдзел грамадзян і арганізацый у працэсе вырашэння грамадска значных праблем, і толькі 14,8% апытаных мяркуюць, што распрацоўка такіх рашэнняў павінна ажыццяўляцца выключна ўнутры дзяржорганаў (дыяграма 15).

Аднак калі рэспандэнтам прапануецца вызначыць, якія менавіта зацікаўленыя бакі мусяць браць удзел у распрацоўцы публічнай палітыкі, найбольш папулярнымі варыянтамі адказаў з'яўляюцца дзяржаўныя экспертныя арганізацыі (46,3%) і органы дзяржкіравання (41,8%) (дыяграма 16).

Грамадзяне лічаць, што палітычныя рашэнні павінны быць абгрунтаванымі, але крыніцай дадзеных і рашэнняў для гэтага абгрунтавання яны бачаць пераважна дзяржаўныя даследчыя структуры, толькі 21,1% насельніцтва разглядае ў гэтай якасці




*Дыяграма 15.*
*Размеркаванне адказаў на пытанне «Як, на ваш погляд, дзяржава мусіць арганізаваць працэс вырашэння грамадсказначных праблем у нашай краіне?»*




*Дыяграма 16.*
*Размеркаванне адказаў на пытанне: «Хто, на ваш погляд, мусіць браць удзел у распрацоўцы палітыкі дзяржавы ў розных сферах (эканоміка, адукацыя, ахова здароўя, сацыяльная палітыка і інш.) у нашай краіне?»*

недзяржаўныя даследчыя цэнтры і 18,4% — міжнародныя арганізацыі. Гэтыя інстытуты таксама карыстаюцца найменшым даверам у жыхароў Беларусі, і пра іх працу мала ведаюць (гл. дыяграму 7).

Рэспандэнты адзначаюць неабходнасць удзелу ў распрацоўцы публічнай палітыкі і іншых стэйкхолдараў, якія могуць быць кампетэнтныя ў вырашэнні канкрэтных праблем: грамадзян і арганізацыі, якіх непасрэдна тычыцца тое, якая распрацоўваецца палітыка (34,1%), а таксама актывістаў і грамадскія арганізацыі з вопытам практычнай работы ў адпаведных сферах (30,9%). Гэтыя паказчыкі падаюцца дастаткова высокімі, калі супаставіць іх з нізкім узроўнем даверу АГС: не надта давяраючы ім, грамадзяне тым не менш бачаць іх у якасці ўдзельнікаў працэсу выпрацоўкі публічнай палітыкі. Ідэя максімальна шырокага грамадзянскага ўдзелу на самай справе мае прыхільнікаў сярод беларусаў:

23,9% рэспандэнтаў лічаць, што ў распрацоўцы палітыкі павінны ўдзельнічаць усе жадаючыя (праз арганізаваныя дзяржавай кансультацыі).

Рэспандэнты, якія лічаць, што за іх дабрабыт адказваюць яны самі, выступаюць за больш шырокі ўдзел недзяржаўных стэйкхолдараў у працэсе распрацоўкі палітыкі. У той час як больш за палову (53,3%) рэспандэнтаў, якія разлічваюць на падтрымку дзяржавы ў пытаннях дабрабыту, адводзяць органам дзяржкіравання галоўную ролю ў распрацоўцы дзяржаўнай палітыкі.

Ацэнка таго ці іншага спосабу грамадзянскага ўдзелу як эфектыўнага не заўсёды азначае, што людзі асабіста гатовыя браць удзел у прыняцці рашэнняў менавіта такім чынам (дыяграма 17).

Напрыклад, працу з петыцыямі ў інтэрнэце лічаць эфектыўнай і гатовыя прымаць удзел практычна аднолькавая колькасць рэспандэнтаў (21%), бо гэта даволі лёгкі і шырокадаступны спосаб удзелу, які патрабуе часцяком толькі некалькіх клікаў. Накіраванне ж сваіх прапаноў распрацоўнікам палітыкі і ўдзел у грамадскіх абмеркаваннях эфектыўнымі лічаць 29,5 і 25,3% адпаведна, а браць удзел у гэтых відах актыўнасці гатовыя ўсяго 18,6 і 18,8%. Магчыма, розніца тлумачыцца досыць высокай «працазатратнасцю» гэтых спосабаў удзелу: яны патрабуюць ад грамадзян развіцця навыкаў і кампетэнцый, выдаткаў часу і інтэлектуальных рэсурсаў. Улічваючы, што практычна траціна рэспандэнтаў лічыць, што АГС, кампетэнтныя ў тэме рашэння, якое прымаецца, павінны ўдзельнічаць у яго распрацоўцы і прыняцці, можна меркаваць, што грамадскія арганізацыі знойдуць падтрымку грамадзян, прапаноўваючы ўласную экспертызу, а таксама выступаючы фасілітатарамі і пасрэднікамі паміж грамадзянамі і дзяржавай у працэсах публічных абмеркаванняў рашэнняў, якія прымаюцца.

Праца ў органах дзяржаўнага кіравання не разглядаецца рэспандэнтамі як магчымасць здзяйсняць істотны ўплыў на фарміраванне палітыкі ў нашай краіне. Жыхары краіны не вераць у тое, што асобны чыноўнік можа ўплываць на прыняцце рашэнняў, і не хочуць звязваць сваю прафесійную дзейнасць з дзяржслужбай.

Амаль пятая частка рэспандэнтаў (18%) лічыць эфектыўным далучэнне да арганізацый грамадзянскай супольнасці для адстойвання сваіх інтарэсаў. Гатоўнасць жа далучыцца да гра-




*Дыяграма 17.*
*Параўнанне размеркавання адказаў на пытанні «Якая форма ўдзелу ў працэсе распрацоўкі і прыняцця важных для грамадства рашэнняў (напрыклад, распрацоўка або адмена законаў, дэкрэтаў і іншых нарматыўных прававых актаў (НПА) органаў улады) з'яўляецца эфектыўнай у нашай краіне?» і «У якіх формах удзелу ў распрацоўцы і прыняцці важных для грамадства рашэнняў вы гатовыя браць удзел?»*

мадскіх арганізацый і ініцыятыў выказалі толькі 12% апытаных. Падобную пазіцыю рэспандэнты маюць у дачыненні да ўдзелу ў дазволеных мірных акцыях пратэсту.

Прасоўванне сваіх ідэй праз мясцовых дэпутатаў лічыцца найменш эфектыўным (8,7%), як і ўдзел у працы палітычных партый (9,4%): ва ўяўленні беларусаў прадстаўнікі мясцовай улады і партыі практычна не здольныя ўплываць на працэс прыняцця палітычных рашэнняў і даваць рады канкрэтным праблемам.

Найбольш верагоднымі прычынамі далучэння людзей да грамадскіх арганізацый і ініцыятыў былі названыя агульныя каштоўнасці (42,5%), дапамога з боку арганізацыі ў вырашэнні праблем рэспандэнта (41,0%), выразныя мэты арганізацыі (32,9%) і ўдзел у цікавых праграмах або праектах (31,4%) (табліца 6).

*Табліца 6.*

*Якія з ніжэйпералічаных прычын вашага ўдзелу ў дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў і іншых некамерцыйных арганізацый / грамадзянскіх ініцыятыў вы лічыце магчымымі?*

| | *Доля тых, хто даў адказ, %* |
|---|---|
| Калі мае каштоўнасці супадаюць з каштоўнасцямі арганізацыі / ініцыятывы | 42,5 |
| Калі яна можа вырашыць маю праблему | 41,0 |
| Калі ў яе выразныя, ясныя мэты | 32,9 |
| Калі яна рэалізуе цікавыя праграмы / праекты | 31,4 |
| Складана адказаць | 14,9 |
| Калі яна мае грамадскую падтрымку | 13,7 |
| Калі ў яе яскравы ідэйны лідар | 7,8 |
| Калі ў ёй працуюць прыемныя людзі | 7,1 |
| Калі яна знаходзіцца блізка ад майго дому | 3,2 |
| Калі ў яе прыгожы офіс | 0,7 |

Можна казаць пра ўсвядомленае, прагматычнае стаўленне рэспандэнтаў да магчымага ўдзелу ў дзейнасці АГС. У даследаванні інтэрнэт-аўдыторыі, праведзеным у пачатку 2018 г. Офісам еўрапейскай экспертызы і камунікацыі і Baltic Internet Policy Initiative, асноўнай прычынай, па якой людзі гатовыя ўключацца ў працу грамадскіх арганізацый, таксама з'яўляюцца агульныя каштоўнасці. Рэшта матываў-лідараў у двух даследаваннях таксама супадаюць.

Існуе ўзаемасувязь узросту рэспандэнтаў і прычын магчымага ўдзелу ў дзейнасці грамадскіх арганізацый. Для маладых людзей (18–24 гады) значны асобасны фактар (прыемныя людзі, яркі лідар). Рэспандэнты ва ўзросце ад 25 да 34 гадоў схільныя больш значэння надаваць змястоўнай частцы работы арганізацый, іх праграмам і мэтам. Для групы ад 65 гадоў больш важныя рашэнне асабістых праблем рэспандэнта і блізкасць офіса арганізацыі ад дому.

## Нацыянальная ідэнтычнасць як фактар грамадзянскай актыўнасці

Нацыянальную ідэнтычнасць і яе спецыфіку можна расцэньваць як адзін з фактараў дынамікі грамадзянскай супольнасці, паколькі нацыянальная праблематыка з'яўляецца комплекснай і аб'ядноўвае ўсе сферы грамадскага жыцця: эканамічную, культурную, палітыка-прававую і ўласна этнічную.

Пераважная большасць рэспандэнтаў (85,2%) вызначылі сваю нацыянальнасць як беларус / беларуска, што практычна супадае з паказчыкамі перапісу насельніцтва 2009 года (84,3%). У цэлым па краіне беларускую мову лічаць роднай 47,0%, што на 8,1% больш, чым у 2009 годзе (дыяграма 18). Сярод рэспандэнтаў, якія лічаць сябе беларусамі, роднай беларускую мову лічаць 53,4%, рускую — 45,3%.

З усіх апытаных па-руску дома гавораць 74,8%, па-беларуску — 3,4%, на беларускай і рускай мовах у роўнай ступені — 21,5%.

У дынаміцы ацэнкі ўзроўню валодання беларускай мовай ёсць пэўныя пазітыўныя змены ў параўнанні з 2012 годам: павялічылася колькасць рэспандэнтаў, якія лічаць, што яны валодаюць




*Дыяграма 18.*
*Якую мову вы лічыце роднай?*




*Дыяграма 19.*
*Ацэнка рэспандэнтамі свайго ўзроўню валодання беларускай мовай (у дынаміцы з 2009 па 2017 г.)*

беларускай мовай «добра» і «вельмі добра», і знізілася колькасць тых, хто ацэньвае свае веды як «пасрэдныя» (дыяграма 19).

Беларуская мова павольна губляе палітычную афарбоўку. Колькасць тых, хто лічыць, што людзі, якія заўсёды размаўляюць па-беларуску ў паўсядзённым жыцці, адносяцца да апазіцыі ці

з'яўляюцца нацыяналістамі, трохі знізілася (табліца 7). Пры гэтым знізілася і колькасць тых, хто «гераізуе» пастаяннае ўжыванне беларускай мовы (варыянт адказу «сапраўдныя беларусы, патрыёты»), але павялічылася колькасць тых, хто не звяртае на гэта ўвагі і не задумваецца пра гэта.

*Табліца 7.*
*Што вы думаеце пра людзей, якія размаўляюць заўсёды толькі па-беларуску?*

| | *2009 г., %* | *2012 г., %* | *2017 г., %* |
|---|---|---|---|
| «Сапраўдныя беларусы, патрыёты» | 49,3 | 46,7 | 36,4 |
| «Вёска» | 5,3 | 6,1 | 3,2 |
| «Апазіцыя» | 4,2 | 8,9 | 6,4 |
| «Дзіўныя людзі» | 2,7 | 4,4 | 6,2 |
| «Нацыяналісты» | 3,3 | 5,2 | 2,9 |
| «Працуюць на публіку: хочуць пакрасавацца, «выпендрыцца» | 6,3 | 7,5 | 5,8 |
| «Эліта нацыі» | 5,5 | 10,4 | 4,4 |
| Не звяртаю на гэта ўвагу (ніколі не думаў пра гэта) | 24,3 | 28,9 | 32,2 |
| Няма адказу / Складана адказаць | 4,2 | 3,3 | 2,5 |

Змена стаўлення да беларускай мовы на больш нейтральнае можна расцэньваць, апроч іншага, як вынік дзейнасці арганізацый і ініцыятыў, якія папулярызуюць беларускую мову і культуру. Напрыклад, пазнавальнасць грамадскай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі!» узрасла за апошнія чатыры гады з 8,2% да 17,2%.

Пры ацэнцы культурна-гістарычнай аўтаномнасці беларускай нацыі насельніцтва падзяляецца практычна папалам. Варыянт адказу «Беларусы — асобны народ з уласнай гісторыяй і культурай» выбралі 46,1% апытаных, «Беларусы, рускія і ўкраінцы — частка трыадзінай славянскай нацыі» — 46,2% (табліца 8).

*Табліца 8.*
*З якім з прыведзеных ніжэй меркаванняў вы згодныя ў найбольшай ступені?*

| | *2009 г., %* | *2017 г., %* |
|---|---|---|
| Беларусы — асобны народ з уласнай гісторыяй і культурай | 51,8 | 46,1 |
| Беларусы, рускія і ўкраінцы — частка трыадзінай славянскай нацыі | 41,9 | 46,2 |
| Беларусы — штучнае ўтварэнне, прыдуманае інтэлігенцыяй, беларусы насамрэч рускія | 1,5 | 3,1 |
| Беларусы — штучнае ўтварэнне, прыдуманае рускімі, беларусы насамрэч палякі | 1,1 | 1,1 |
| Складана адказаць / Няма адказу | 3,6 | 3,5 |

Маладыя людзі ва ўзросце 18–24 гадоў часцей за іншых рэспандэнтаў вызначалі беларусаў як «асобны народ з уласнай гісторыяй і культурай» (58,8%).

Паміж уяўленнямі людзей пра гісторыка-культурную аўтаномнасць беларускага народа і іх бачаннем асаблівасцяў грамадзянскага ўдзелу ў грамадска-палітычных працэсах у нашай краіне ёсць сувязь. Рэспандэнты, якія разглядаюць беларусаў як асобны народ, больш выступаюць за прыцягненне дзяржавай экспертнай супольнасці і незалежных арганізацый для вырашэння грамадска значных праблем (25,1% супраць 18,7%) (дыяграма 20).

У той час як рэспандэнты, якія ўяўляюць беларусаў часткай трыадзінай усходнеславянскай нацыі, у большай ступені схіль-




*Дыяграма 20.*
*Размеркаванне адказаў на пытанне «Як дзяржава павінна арганізаваць працэс рашэння грамадска значных праблем у нашай краіне?»*

ныя выступаць за максімальна шырокі ўдзел грамадзян і арганізацый, што прапануюць свае варыянты вырашэння праблем.

Такім чынам, у прадстаўнікоў першай групы знаходзіць большы водгук элітысцкі падыход да працэсу кіравання дзяржавай. На карысць гэтага сцвярджэння сведчыць і параўнанне размеркаванняў адказаў рэспандэнтаў у адносінах да суб'ектаў — удзельнікаў распрацоўкі палітыкі дзяржавы (дыяграма 21).

Прадстаўнікі першай групы ў параўнанні з другой аддаюць перавагу міжнародным і недзяржаўным экспертным арганізацыям, АГС і іх прадстаўнікам, а таксама зацікаўленым грамадзянам. Тыя, хто разглядае беларусаў як частку трыадзінай славянскай нацыі, больш выступаюць за вядучую ролю дзяржавы ў распрацоўцы палітыкі ў розных сферах. За ўдзел органаў дзяржкіравання выступаюць 45,4% прадстаўнікоў гэтай групы супраць 41,1% прыхільнікаў гісторыка-культурнай аўтаноміі; дзяржаўных экспертных арганізацый — 49,5% супраць 44,8%; усе жадаючыя праз арганізаваныя дзяржавай кансультацыі — 27,9% супраць 20,0%.




*Дыяграма 21.*
*Хто мусіць удзельнічаць у распрацоўцы палітыкі дзяржавы ў розных сферах у нашай краіне?*
*1. Органы дзяржаўнай улады і кіравання, 2. Дзяржаўныя даследчыя інстытуты, цэнтры і іншыя экспертныя арганізацыі, 3. Міжнародныя арганізацыі, эксперты, 4. Недзяржаўныя даследчыя інстытуты, цэнтры і іншыя экспертныя арганізацыі, 5. Актывісты і грамадскія арганізацыі з вопытам практычнай работы ў адпаведных сферах, 6. Грамадзяне і арганізацыі, якіх непасрэдна датычыцца палітыка, якая распрацоўваецца, 7. Усе жадаючыя грамадзяне праз спецыяльна арганізаваныя дзяржаўнымі органамі кансультацыі, 8. Складана адказаць*

## Высновы

● Амаль палова насельніцтва Беларусі мае настроенасць на давер да людзей і лічыць давер умовай поспеху ў жыцці. Людзі з больш высокім узроўнем генералізаванага даверу схільныя больш давяраць грамадскім інстытутам. Жанчыны і людзі старэйшыя за 65 гадоў адрозніваюцца больш высокім узроўнем даверу ў цэлым і больш схільныя звязваць давер да людзей з поспехам у жыцці.

● Разам з памяншэннем сацыяльнай арыентаванасці беларускай дзяржавы зніжаецца і вера ў тое, што яна возьме на сябе

адказнасць за дабрабыт людзей. Жыхары Беларусі ў складаных жыццёвых сітуацыях схільныя больш спадзявацца на сябе, чым на дзяржаву. Працяг гэтай тэндэнцыі можа прывесці да росту грамадскай актыўнасці і павышэння цікавасці да грамадзянскага ўдзелу.

● Беларусы больш схільныя не давяраць дзяржаўным і недзяржаўным сацыяльна-палітычным інстытутам, чым давяраць.

● Арганізацыі грамадзянскай супольнасці маюць самы нізкі ў параўнанні з іншымі сацыяльнымі інстытутамі ўзровень даверу рэспандэнтаў, беларускія грамадзяне мала ведаюць пра іх дзейнасць.

● На фоне невысокага ўзроўню інстытуцыйнага даверу актуалізуецца міжасабовы давер, а таксама давер да прадстаўнікоў пэўных сацыяльных і прафесійных груп. Постаць грамадскага актывіста мае больш высокі патэнцыял даверу ў параўнанні з грамадскімі арганізацыямі. У чыноўнікаў і палітыкаў — самы нізкі ўзровень даверу.

● Нягледзячы на нізкую інфармаванасць аб дзейнасці арганізацый грамадзянскай супольнасці і нізкі ўзровень даверу да іх, жыхары Беларусі маюць дастаткова ліберальныя погляды на адносіны дзяржавы і грамадзянскай супольнасці: на думку насельніцтва, дзяржава павінна ствараць спрыяльныя ўмовы для дзейнасці АГС, якія працуюць на законных падставах.

● Патрабаванні, якія ўлады маюць права прад'яўляць да АГС, на думку беларусаў, таксама не мусяць выходзіць за межы захавання законнасці ў сваёй працы. Патрабаванні абмежавання кантактаў АГС з бізнесам і палітыкай, а таксама іх лаяльнасці да дзяржавы не з'яўляюцца актуальнымі для грамадзян. Грамадзяне таксама не лічаць, што адсутнасць як кааператыўнага, так і канфрантацыйнага ўзаемадзеяння з уладай неабходная.

● Ціск з боку ўладаў на грамадзянскую супольнасць усведамляецца доляй насельніцтва, аднак пятая частка нашых суграмадзян не мае меркавання адносна ўмоваў працы арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.

● Насельніцтва Беларусі ў большай ступені ўсведамляе ролю арганізацый грамадзянскай супольнасці як памочнікаў дзяржавы і грамадзян у вырашэнні сацыяльных праблем і абаронцаў правоў і інтарэсаў, функцыя незалежнага кантролю ўлады ўсведамляец-

ца слаба. Неабходна больш інфармацыі пра ўплыў грамадзянскага ўдзелу і кантролю на якасць прымаемых рашэнняў і пра спосабы яго ажыццяўлення, уключаючы практычныя прыклады.

● Жыхары Беларусі схіляюцца да прыняцця рашэнняў пры шырокім грамадзянскім удзеле. Аднак у іх разуменні шырокі ўдзел азначае хутчэй уцягванне зацікаўленых бакоў (арганізацый і грамадзян, кампетэнтных у канкрэтным пытанні), чым удзел усіх жадаючых.

● Людзі лічаць грамадскія абмеркаванні і дасыланне прапаноў у дзяржаўныя органы дастаткова эфектыўным спосабам удзелу, але самі не гатовы ў гэтым браць удзел. Можна меркаваць, што грамадскія арганізацыі знойдуць падтрымку грамадзян, прапаноўваючы ўласную экспертызу ў данясенні іх думкі да ўлады, а таксама выступаючы фасілітатарамі і пасрэднікамі між грамадзянамі і дзяржавай у дыскусіі з нагоды рашэнняў, што прымаюцца імі.

● Стаўленне нашых суграмадзян да беларускай мовы мяняецца з палітычна афарбаванага на больш нейтральнае. Можна казаць пра тое, што беларуская мова становіцца часткай штодзённасці. Беларусы лічаць, што за апошнія пяць гадоў яны сталі лепш валодаць беларускай мовай.

● Не выяўлена істотных адрозненняў у дачыненні рэспандэнтаў да грамадзянскага ўдзелу ў залежнасці ад нацыянальнай прыналежнасці. Аднак рэспандэнты, якія прызнаюць беларусаў асобнай нацыяй, праявілі вялікую зацікаўленасць ва ўдзеле і распрацоўцы палітыкі такіх недзяржаўных суб’ектаў, як грамадскія арганізацыі і грамадзянскія актывісты, незалежныя экспертныя супольнасці, міжнародныя арганізацыі.